ПРАВІЛЫ «ВЯЛІКАГА КЛУБА»

Чым запомніўся саміт G20 у Буэнас-Айрэсе?

У канцы мінулага тыдня эпіцэнтр сусветнай геапалітыкі перамясціўся ў непаўторны Буэнас-Айрэс. У аргенцінскай сталіцы адбыўся саміт «Вялікай дваццаткі» (G20).
Да кіраўніка паўднёва-амерыканскай дзяржавы Маўрысіа Макры з'ехаліся яго калегі з Аўстраліі, Бразіліі, Канады, Кітая, Францыі, Германіі, Індыі, Інданезіі, Італіі, Японіі, Мексікі, Расіі, Саудаўскай Аравіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, Паўднёвай Карэі, Турцыі, Вялікабрытаніі і ЗША.
Карацей кажучы, увесь «вялікі клуб» быў у зборы.
Праўда, у шэрагу экспертаў існавала сур'ёзная асцярога наконт таго, што сёлетні саміт акажацца ці не самым канфліктным за ўсю гісторыю існавання G20.
Але абышлося. Лідары ўзгаднілі выніковую дэкларацыю. Чым жа запомніўся аргенцінскі саміт?

Паміж крызісамі

«Вялікая дваццатка» (G20, афіцыйна — The Group of Twenty, major advanced and emerging economies) — міжнародны ўплывовы клуб урадаў і кіраўнікоў цэнтральных банкаў шэрагу вядучых дзяржаў. Тут прадстаўлены ўсе заселеныя кантыненты планеты. Удзельнікамі G20 з'яўляюцца 20 найбуйнейшых нацыянальных эканомік свету — 19 краін плюс Еўрапейскі саюз. У сукупнасці прастора G20 фарміруе 85 працэнтаў аб'ёму сусветнага валавога ўнутранага прадукту, 75 працэнтаў — сусветнага гандлю, на гэтай тэрыторыі жыве дзве трэці насельніцтва планеты.

«Вялікая дваццатка» паўстала ў канцы 1990-х, калі азіяцкія краіны былі ахоплены фінансавым крызісам, а заходнія не ведалі, як на яго рэагаваць. Тады міністры фінансаў «Вялікай васьмёркі» выступілі з ініцыятывай пашырыць кола краін для абмеркавання пытанняў фінансавай палітыкі, запрасіўшы туды такія буйныя дзяржавы, як Кітай і Індыя, без якіх, відавочна, не ўяўлялася магчымым вырашыць сусветныя эканамічныя праблемы. Своеасаблівы «кастынг» будучых удзельнікаў G20 тады праводзілі ЗША і Вялікабрытанія. У 1997 годзе была сфарміравана G33 — група з 33 краін, на змену якой у снежні 1999-га прыйшла G22, якая праіснавала менш за год і хутка саступіла месца G20. Як адзначае vz.ru, узнікненне «дваццаткі» азнаменавала канец заходнецэнтрычнага свету, пачатак пераходу ад атлантычнай мадэлі глабалізацыі да фарміравання новага балансу сіл, пабудовы новага светапарадку.

Зрэшты, пасля ўстаноўчай канферэнцыі ў Берліне ў снежні 1999 года аб G20 практычна забыліся. Да новага фінансавага крызісу, які настаў у 2008-м, самітаў не праводзілася: асноўным фарматам былі штогадовыя сустрэчы міністраў фінансаў і кіраўнікоў цэнтрабанкаў. Аб тым, што сітуацыя ў сусветнай эканоміцы была крытычная, сведчыць і тое, што саміты G20 у канцы 2000-х збіраліся не раз на год, а як экстранныя нарады. Першая, з назвай «антыкрызісная», прайшла у лістападзе 2008 года ў Вашынгтоне, наступная — ужо ў красавіку 2009-га ў Лондане, а ў верасні таго ж года «дваццатка» сабралася ў Пітсбургу.

Вастрыня эканамічнага крызісу з часам прайшла, і G20 фактычна перамясцілася на палітычны ўзровень. Як заўважаюць эксперты, форум, які аб'ядноўвае краіны з розных частак свету, нашмат больш рэпрэзентатыўны і збалансаваны, чым «Вялікая васьмёрка». Як заўважыла загадчык аддзела глабальных эканамічных праблем і знешнеэканамічнай палітыкі Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН Людміла Худзякова, з антыкрызіснага інстытута G20 трансфармавалася ў шырокую міжнародную платформу для выпрацоўкі стратэгіі па забеспячэнні ўстойлівага і збалансаванага эканамічнага росту, а таксама для абмеркавання найбольш актуальных эканамічных і палітычных сусветных праблем на палях саміту, у тым ліку ў рамках двухбаковых сустрэч лідараў. Менавіта апошняе аказваецца сёння ў цэнтры ўвагі сусветнай супольнасці.

Дзе знайсці 100 трыльёнаў долараў?

Саміт G20 у Аргенціне стаў першым зборам «Вялікай дваццаткі» на лацінаамерыканскім кантыненце. І гэта адыграла пэўную ролю ў выбары прыярытэтных напрамкаў для абмеркавання, сярод якіх падтрыманне занятасці ва ўмовах лічбавай эканомікі, гарантаванне харчовай бяспекі, стварэнне інфраструктуры. Лозунг сёлетняга саміту G20 — «Дасягаць кансэнсусу для справядлівага і ўстойлівага развіцця». У гэтай сувязі вялікая ўвага надавалася пытанням устойлівага фінансавання. Асаблівая роля ў гэтым глабальным працэсе адводзіцца інстытуцыянальным інвестарам, якія, дарэчы, кіруюць прыкладна 100 трыльёнамі долараў актываў па ўсім свеце, але пакуль іх доля ва ўстойлівым фінансаванні нікчэмна малая.

На саміце ў Буэнас-Айрэсе былі разгледжаны і адобраны даклады па асноўных напрамках усё яшчэ не завершанай глабальнай эканамічнай рэформы. Як лічыць Людміла Худзякова, найважнейшай задачай застаецца забеспячэнне фінансавай стабільнасці і адсочванне сістэмных рызык. Нароўні з традыцыйнымі рызыкамі міжнародныя фінансавыя інстытуты ўсё большую ўвагу аддаюць маніторынгу новых, асабліва тых, якія могуць паўстаць у сувязі з актыўнай лічбавізацыяй глабальных фінансаў. У адным з дакладаў на саміце прагучала, што крыптавалюты цяпер разглядаюцца не як міжнародны плацежны сродак, паколькі ў гэтай якасці яны пакуль шырока не выкарыстоўваюцца, а як укладанні ў актывы. Таму аўтары адпаведнага даследавання лічаць, што на дадзены момант «крыпта» не ўяўляе матэрыяльнай рызыкі для глабальных фінансавых рынкаў, хутчэй, гэта могуць быць рызыкі для інвестараў і спажыўцоў фінпаслуг. Тым не менш, як перакананы аналітыкі, неабходна пастаянна адсочваць аперацыі ў гэтым вельмі хуткаруслым сегменце.

Кліматычны «тэст»

Падчас прэзідэнцтва Аргенціны ўпершыню ў гісторыі G20 рабочая група па ўстойлівым клімаце (Climate Sustainability Working Group) была выдзелена ў самастойнае падраздзяленне, хоць раней адпаведныя пытанні аб'ядноўваліся з энергетычнымі. Як расказала Людміла Худзякова, прыняцце такога рашэння менавіта на саміце ў Аргенціне не дзіўнае, калі ўлічыць шматлікія страты ад стыхійных бедстваў і экстрэмальных з'яў надвор'я ў краінах Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Тым не менш у сумеснай заяве захаваўся раздзел пазіцый ЗША і астатніх краін «дваццаткі» па клімаце. Злучаныя Штаты пацвердзілі намер выйсці з Парыжскага пагаднення. У той жа час усе краіны G20 заявілі аб прыхільнасці да развіцця чыстай энергетыкі.

Краіны «дваццаткі» сышліся ў меркаванні, што сістэма міжнароднага гандлю і Сусветная гандлёвая арганізацыя павінны быць удасканалены. На думку ўдзельнікаў саміту, дзеючая сістэма «не вырашае пастаўленых перад ёй задач». Неабходныя рэформы лідары абмяркуюць на наступнай сустрэчы, якая пройдзе налета ў Японіі. «Дваццатка» таксама ўхваліла план дзеянняў па барацьбе з карупцыяй на найбліжэйшыя тры гады. Акрамя таго, лідары краін G20 заклікалі да процідзеяння выкарыстанню інтэрнэту ў тэрарыстычных мэтах і адзначылі важнасць сумесных дзеянняў для ліквідацыі прычын, якія вымушаюць людзей бегчы са сваіх краін. Прэзідэнт Расіі, які правёў у Буэнас-Айрэсе шэраг прадукцыйных сустрэч (у прыватнасці, з кіраўнікамі Японіі, Германіі, Турцыі, Францыі, Аргенціны, Саудаўскай Аравіі), назваў падагульняльны дакумент саміту G20 «станоўчым вынікам», хоць ён і «носіць агульны характар».

«Замарозка» на 90 дзён

Ад сустрэчы з Уладзімірам Пуціным Дональд Трамп адмовіўся, а вось з Сі Цзіньпінам перагаворы правёў. Дзяржаўнае тэлебачанне КНР першым абвясціла сусветную навіну: на рабочай сустрэчы лідараў ЗША і Кітая ў Буэнас-Айрэсе было вырашана не ўводзіць новых узаемных гандлёвых пошлін пасля 1 студзеня 2019 года. У заяве Белага дома, апублікаванай крыху пазней, адзначалася, што мараторый на ўвядзенне павышаных тарыфаў працягнецца 90 дзён, і гэты час будзе выкарыстаны для двухбаковых перагавораў. Штаты прыпыняць далейшы рост пошлін на кітайскі экспарт, а Паднябесная ў адказ пагадзілася закупіць вырабленую ў ЗША сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю «ў вельмі істотных аб'ёмах».

Сустрэча прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і старшыні КНР Сі Цзіньпіна доўжылася звыш дзвюх гадзін — больш, чым планавалася. Хоць перагаворы адбыліся ўжо пасля заканчэння саміту G20 у Аргенціне, яны сталі цэнтральнай падзеяй сустрэчы «Вялікай дваццаткі». «Кітайска-амерыканскія адносіны ідуць не так гладка, як гэта трэба для добрага стану спраў у свеце, — заявіла на саміце канцлер Германіі Ангела Меркель. — Ускосна гэта адбіваецца на ўсіх нас».

Напярэдадні сустрэчы прэзідэнт ЗША падкрэсліваў, што ў іх з Сі Цзіньпінам вельмі добрыя адносіны. «Думаю, у першую чаргу па гэтай прычыне мы, мабыць, у рэшце сыдземся на тым, што будзе добра для Кітая і добра для Злучаных Штатаў», — сказаў Трамп. Дарэчы, перагаворы ў Аргенціне былі сумешчаныя з абедам: у меню быў стэйк «сірлойн», блінцы з карамеллю і аргенцінскае віно. Згодна з паведамленнем кітайскага афіцыйнага агенцтва навін «Сіньхуа», падчас рабочага абеду старшыня КНР падкрэсліў, што супрацоўніцтва — найлепшы выбар для абедзвюх краін.

Неспакойны час

«Вялікая дваццатка», як адзначаюць эксперты, дае ўнікальную штогадовую магчымасць ацаніць расклад сіл на сусветнай арэне, убачыць яго змены і асабістыя адносіны лідараў не толькі ў фармаце адзін на адзін, але і ў атмасферы салона. Мяркуючы па гэтых «маркерах», уся сістэма міжнародных адносін — што палітычная, што гандлёва-фінансавая — знаходзіцца не проста ў крызісе, а ў працэсе кардынальнай перабудовы, адзначае vz.ru. І адзінае, што па-сапраўднаму хвалюе ўсіх сусветных лідараў у гэтай сувязі, — ці стане гэты працэс рэфармавання больш-менш кіраваным або выльецца ў прамы канфлікт паміж рознымі цэнтрамі сілы і блокамі.

Як заўважаюць эксперты, геапалітычныя разломы і канфлікты будуць ісці не толькі па лініі Поўнач — Поўдзень або Захад — Усход, але і ўнутры самога Захаду. Усе больш прыкметныя як спробы кансалідавацца з боку новых самастойных цэнтраў сілы (напрыклад, Паўднёва-Усходняй Азіі), так і складванне новых альянсаў і расхістванне старых.

Дарэчы, аргенцінскі саміт пачаўся землетрасеннем (усё ж такі ён быў 13-ы), а завяршыўся штармавым ветрам. Выглядае сімвалічна.

Захар БУРАК.